Калі ў мяне надараецца вольная хвіліна, я іду да сваёй бабулі Валі, якая жыве непадалёку, у вёсцы Косіна. Бабуля клапатліва захоўвае фотаздымкі дзядоў і прадзедаў і можа многае пра іх расказаць. І тады здаецца, што яны тут, побач з намі.

# Людзі, аб'яднаныя адным лёсам



**Вераніка Аляксандраўна Бразоўская,**
настаўнік гісторыі і грамадазнаўства другой кваліфікацыйнай катэгорыі ДУА «Плешчаніцкая сярэдняя школа № 2 Лагойскага раёна»

Мая прабабуля Кацярына Міхайлаўна Апановіч (Кароль) і яе родны брат Васіль Міхайлавіч Кароль — удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны. Нарадзіліся яны ў прыгожай вёсцы Бараўляны Барысаўскага раёна, непадалёку ад возера Палік, у мнагадзетнай сялянскай сям'і. Дзяцей было васьмёра. Васіль і Каця былі старэйшыя. У школу хадзілі за пяць кіламетраў у вёску Карсакавічы. Вучыліся старанна і паспяхова, пасля школы Каця дапамагала маці гадаваць малых. Бацька Міхаіл Кароль з ранку да ночы працаваў у полі. Васіль дапамагаў з гаспадаркай: змалку касіў, даглядаў свойскую жывёлу. Пасля заканчэння васьмігодкі хлапец паступіў у Барысаўскі педагагічны тэхнікум, а праз два гады па яго слядах пайшла і Каця. У той час пры тэхнікуме не было інтэрнатаў, і брат з сястрой жылі ў Барысаве ў цёткі Веры — сястры маці.

Васіль першы закончыў тэхнікум, і яго накіравалі на працу ў вёску Пяршаі Валожынскага раёна, а Каця працягвала вучобу. Пачалася падрыхтоўка да здачы экзаменаў, выпускнога балю. Дзяўчына марыла хутчэй пайсці на працу, але ўсё гэта перакрэсліла жудасная вестка: 22 чэрвеня 1941 г. пачалася Вялікая Айчынная вайна. І Каця, і Васіль прыехалі ў вёску, дзе дапамагалі бацькам.

***

Вёска знаходзілася сярод непралазных лясоў і балот, і на пачатку 1942 г. тут быў створаны партызанскі атрад «Бывалыя», які за кароткі час ператварыўся ў партызанскую брыгаду «Дзядзькі Колі». Камандаваў брыгадай Герой Савецкага Саюза Пётр Рыгоравіч Лапацін — чэкіст, камандзір разведатрада НКДБ СССР. Да партызан далучыліся Васіль і Каця. Васіль застаўся ў брыгадзе, а Каці сказалі, што ёй пажадана быць дома.

Бацькоўская хата стаяла ля самага лесу. Сюды часта наведваліся партызаны. Сям'я была вялікая, але з партызанамі дзяліліся апошнім кавалкам хлеба, паведамлялі вясковыя навіны. Жанчыны дапамагалі рамантаваць адзенне і абутак, а потым Каця адносіла рэчы ў лес.

Уначы дадому часта прабіраўся Васіль. Ён быў разведчыкам, хадзіў з партызанамі мініраваць чыгунку, удзельнічаў у рабоце падпольнага друку. Выданні потым разносілі ў вёскі, шпіталі. Заклікалі мясцовых жыхароў у атрад на барацьбу супраць ворага. Дарэчы, на Паліку выпускалася плешчаніцкая раённая газета «Ленінец», а таксама газеты «Народны мсцівец», «Чырвоны

**ЧИТАЙТЕ В СВЕЖЕМ НОМЕРЕ «ОМ»**